МУЗЕЙ Р.К.К.А.
№ 1523

ВОЛЬНАЯ БЕЛАРУСЬ

Цэна асобнага № 15 кап.

Умовы падпіскі на 1917 год.

За 1 м.	За 2 м.	За 3 м.	За 4 м.	За 5 м.	За 6 м.	За 7 м.	За 8 м.	За 9 м.
1 р.	2 р.	3 р	4 р.	5 р.	6 р.	7 р.	8 р.	9 р.

Падпіска прымаяцца толькі с 1-го числа кожнага месяца.

Перамена адрэсу—50 коп. Пры зьмені адрэса конча прыкладаць стары адрэс.

Рукапісы павінны быць чытэльна напісаны і толькі з аднаго боку паперы. Кепска перапісаныя рукапісы ні чытацца, ні друкавацца ня будуць.

На ліставання, перасылку рукапісау і іншыя адказы-павінны прыкладацца маркі.

Газэта палітычная, эканамічная і літэратурная.

Год выданьня I.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Мінск, Захараўск. 18

Умовы друку абвестак:

(На IV боку газэты) за 1 радок шпальту 40 к. за 2 рад. 80 к. за кожны раз.

Асобам, шукаючым працы — 1 руб. за 3 радкі за адзін раз.

№ 15. 1917 г. Серада. Выходзіць двойчы на тыдзень. 23 жніўня 1917 г. № 15.

Німа веры.

Становішча Дзяржавы Расійскай што даляй, то робіцца горай. Армія адступаецца, вораг пасуваецца ўперад і німагчыма затрымаць яго наступ. Грамадзянства разбілася на два варожыя станы і страчан грунт для паразуменьня. Дараго́ўля расьце, нідахват павялічваецца. Бязладзіца, ніпарадкі агарнулі кругом, як чорнаю хмараю. Гром грыміць, бура ірдзіцца і гатова хлынуць раптоўна сьмяртэльнай навальніцай. А людзі--як людзі. Сходзяцца, радзяцца, жартуюць, сьмяюцца, ды ні маюць веры ні парадам сваім, ні жартам сваім, ні жадным сваім установам. Сталася так, што сама рэвалюцыя страціла сэнс, сілу і значэнне. Пажоўклі яскравыя лёзунгі, жалобай адбіваюцца рэвалюцыйныя песьні, Нікультурныя, цёмныя массы сунуцца ўперад, павінуючыся гавяжаму інстынкту, і ні хочуць уцяміць, што гаспадара німа, што кіраўнік свайго жыцьця ён сам, і калі дзяржаўная машына зразгону заедзе «казла», дык разляціцца на друзгі. Адозвы, прамовы, сходы і зьезды абрыдлі, прыеліся і нікога ні да чаго ні прымушаюць. Мэрам гісторыя аддзялілася ад людзей, а людзі ад гісторыі, і рухаецца ўсё паасобку.

Тым часам, скліканьне Сойму адсунута назад, а разам с тым, траціцца вера, што гэта апошні тэрмін, што за першым адкладам ні пойдзе другі, трэйці і т. д. Але Часовы Урад, пачуваючы сьмяртэльную нібязпеку, як баячны Антэй, ірвецца на ніз, каб ад зямлі набрацца моцы, творчай веры і гаючай сілы. Ен шукае палёгкі ў народзі, дзеля чаго склікае усерасійскую ў Маскве параду. Туды пакліканы прэдстаўнікі усіх партый, усіх арганізацый, усіх грамадзкіх інстытуцый. Паваланы дэпутаты усіх чатырох Гасуд. Дум. Зьедзяцца каля паўтары тысячы людзей, а—веры німа, чамусь нікне надзея, ні відаць спасеньня. Кіраўніцтва дзяржавай траціць даладнасьць, трупціць, як сапсаваная машына і яшчэ больш павялічвае тую багну, што расступілася перад намі і гатова праглынуць і рэвалюцыю, і волю, цэльнасьць і нізалежнасьць самой дзяржавы. Чуюцца пагрозы «крывёй і залезам», але ніхто ні лякаецца і ні зьвяртае увагі. Робіцца уражэньне, што карабель топіцца, захлынаецца вадою, і кожан кідаецца туды, дзе бачыць найблізшы ратунак. Яшчэ чутна каманда, яшчэ аддаюцца прыказы, але ніхто ні верыць у моц карабельнай улады. І кожны сьпешае сесьці у чайку і пашукаць ратунку па ўласнаму дасьледу. І мы бачым, што фінляндцы зьняверыліся ў расійскім урадзі. Напяракор распараджэньню, рыхтуюцца яны адчыніць свой сойм і дамагаюцца вывесьці расійскія войска, выклікаючыя ніпарадкі, ні шануючыя мейсцовых законаў і павялічваючыя цішар харчавой справы. Украінцы, ні здаволяныя наданымі ім правамі, адмаўляюцца пасылаць сваіх прэдстаўнікаў на маскоўскую параду, страціўшы веру ў скутачнасьць супольнай працы. Яны адчаяліся намацаць грунт для супрацоўніцтва і, па тропу фінляндцаў, шукаюць ратунку па асобку. А расійскае грамадзянства, ні прызнаючы свайго гістарычнага грэху нацыянальнага уціску, пасылае ў дагонку пагрозы «крывёю і залезам». Але там, дзе пытаньне пастаўляна руба, дзе справа наўстала а жыцьці і сьмерці,—там пагрозы нікога ні лякаюць, нікога ні спыняюць, нікому ні памогуць, а толькі раскапаюць шырэй тую багну, што залягля паміж імі. Ды й адкуль жа ўзяць тую веру, калі німашака жаднага грунту? Хіба украінцы, ці тыя фінляндцы, ні бачуць як ставіцца урад і усё расійскае грамадзянства да нас, беларусаў? Маўчаць—значыць здаволяны, і хоць-бы словам хто закінуўся аб тым, што беларусы жывуць, дышуць і есьці хочуць. Хіба-ж ні відно, што чуллівае вуха маскоўскага грамадзянства у нацыянальных пытаньнях больш нахіляна да таго, што было, як да таго, што павінна быць? Хіба Часоваму Ураду ні казалі пра нас, хіба ні прасілі яго дапамагчы і падтрымаць нас ў нашым цяжкім становішчу? А ласьня паслухалі нас, ласьня пацешылі нас хоць словам, добрай парадай ці абяцанкай? Сумна, але факт,—вораг робіць тое, што павінян зрабіць сябар. Немяц ні заводзіць спрэчак, што беларусаў німа,—ён разважыў гэта пытаньне даўно, і там ў забранай часьці Беларусі, будуе школы, робіць курсы, друкуе падручнікі. Мала гэтага, ён рыхтуецца зьдзівіць цэлы сьвет заявай, што ў Дзяржаві Расійскай, на бярагах Нёмна і Дзьвіны вынайшоў цэлы асобны народ, с сваім уласным бытам, с асобнай культурай, звычаямі і мовай. Сумна, але факт! А у нас, заява аб сваёй гістарычнай самабытнасьці, аб жаданьні уласнага культурнага жыцьця,—нават лепшымі людзьмі маскоўскага грамадзянства талкуецца, як сэпаратызм, дзяліцьба і калатніна. Дык адкуль-жа узяцца тэй веры?!

„Чаму гэта так?“

Хто уважна чытаў нашу яшчэ маладзенькую, піумацаваную газэту, хто спагадае нам і справі адраджэньня нашага народу, хто хоць крошку знаецца на справі выданьня друкаванага слова у ніспагаднай, цёмнай і малакультурнай гушчы,—той ня можа зрабіць нам даганы, што мы наўмысьля ні па нідбаласьці ухіляемся ад таго ці іншага пытаньня.

Жыцьцё шырокае, вялікае і многакантова,—сілы-ж нашы нівялічкі, шчуплы і кволы і ні мае фізычнай магчымасьці ахапіць ў нумарох колькіх усё кіпучае і шырокае, як мора, жыцьцё нашае многапакутнае старонкі. Мы ня можам судзіць свае працы. Яна мае многа хіб, шмат памылак, нідаглядаў,—гэта так. Але памятаючы, што ні памыляецца той хіба, хто нічога ня робіць,—мы пазваляем спытаць сябе: дзе, што,—які артыкул нашае газэты ніпатрэбян і шкадліў для справы беларускага адраджэньня наагул і дзеля шчасьця й інтарэсу працоўнага народу ў асобку? Калі мы ухіляліся падаць руку пакрыўджанаму, усьцешыць гаротнага, памагчы абяздолянаму? Ці была калі праўда, каб мы, «як злая нянька затыкалі вушы і рот палітыкай, палітыкай і палітыкай»? Ці праўда гэта, што «Вольная Беларусь», «баючы дзіўныя казкі пра вольнасьць айчыны, ні зьвяртала увагі па жыцьцё уцякачоў»? Кожан наш нумар, кожна стацьця і артыкул нашай газэты гэта крык пакрыўджанага, плач абяздоляпага, енк запакутанага. Хто чытаў наш артыкул «Да спакою», у таго язык ні павернецца сказаць нам, што мы забылі братоў сваіх уцякачоў. І толькі агіда да сьлёз і лямэнту стрымоўвае нас пастаянна плакаць, ныць і скардзіцца.

Годзі плакаць! Мы абуджаем павагу, будзім нацыянальны гонар і кожным нумарам газэты клічам беларусаў ні спаць, ачнуцца, забраць сваю справу у свае рукі і будаваць сваё жыцьцё ўласнымі заходамі. Цяжка жывецца уцякачу! «Вольная Беларусь» ведае, што усіх нашых уцякачоў маскале нагамі падкідаюць, што іх лічаць дармаедамі, гультаямі, што «нашы блазноткі--сіраты ні усюды у Расіі маюць добры прытулак», што «беларускім селянам ні справядліва плацяць за збожжа, пакінутае у адрынах і на кораню». Гэта «В. Беларусь» ведае; ведае яна яшчэ і тое, што ні «па прычыні стыхіі апынуліся у Расіі» уцякачы—беларусы, а паразганяла і параскідала іх па шырокай Расіі і халоднай Сібіры варьяцкая рука самадзяржавія. «Вольная Беларусь» ведае, што уцякач ня жыве, пакутуе, што мруць нашы браты на чужыні, як мухі, але ад тае ці іншае стацьці ні палегчае. Тут патрэбна грунтоўная помач, помач кожнага грамадзяніна і ўсяго гасударства. Аркушы нашай газэты шырока разгорнуты для усіх. Прыходзьце, пішыце, гукайце, склікайце! Пішыце ўсё, памагайце грамадой, тады ні паўстане пытаньне «чаму гэта так»? Чаму гэтак было і да гэтага часу ёсьць, што дзесяцімільённы народ ледзьвя здоляў выдаць 15 нумароў газэты; што, выпускаючы нумар сяго́ньня, ня можна быць пэўным, што выдасца заўтра. Чаму яно гэтак,—ці ведаеш, шаноўны чытачу? Чаму гэта так, што досыць зьявіцца на Беларусі беларускаму дзелу, каб зараз абсыпаў яго шашаль і пачаў грызьці й тачыць, покі ні паваліць с кораню? Чаму гэта так,—ці ведаеш, шаноўны чытачу?!

Я. Л—к.

Друк Скарыны і друк сучасны.

Пераглядаючы кніжкі, друкаваные Скарынай і параўнаючы іх з іншымі сучаснымі з імі выданьнямі,—мы мусім прыйсьці да пераканаўня, што друкарскае штукарства Скарына падняў да такой вышыні, да такога дасканалага харства, якога ні да яго, ані нават у час яго выдавецкай працы ні было нігдзе.

Гэткую заслугу нашага Скарыны прызналі ужо усе вучоные, якіе толькі глядзелі з пункту харства ці навукі на яго выданьня.

Кніжкі Скарыны усе вялічынёю у 4-ку (чацьвёртая часьць аркуша паперы), набор літэр на страніцы 20 або 22 строчкі [вершы]; вялічыня ў міллімэтрах: уздоўж 140, у шырыню 109. Чаму Скарына выбраў гэткі фармат кніжак—німа ведама. Мусі быць хацеў, каб кніжкі

15 № „Вольнае Беларусі“ выходзе спозьнена с прычыны забастоўкі друкарні.

яго былі малые, а дзеля таго і танные, значыцца, даступные і бяднейшым людзям. Папера кніжак добрая, трывалая, мае водзячые знакі: бычачая галава, крыж і кружок с крыжам.

Сам шрыфт літары выданняў Скарыны ні падобны да шрыфту таго часу. Відаць, шрыфт быў прыдуман ды нарысован самым Скарынай ды паводлуг яго рысунку вырэзаліся асобныя літэры. У кніжках вялікія літэры усе прыгожыя, пры іх нарысаваны кветкі, лісьці, зьверы, як, напрыклад, каза пры літэры К, людзі, а нават і гэрб Скарыны пры літэры Ч. Застаўкі ды канчаткі амаль усе маюць гэрб Скарыны, так сама і гравюры. На гравюрах вопраткі людзей сучасныя, багатыя. Такія вопраткі насілі знатныя людзі як у Чэхіі, Нямеччыні, так і на Беларусі. Аб усіх гэтых рысунках можна напэўна сказаць, што рысованы яны самым Скарынай, дзеля чаго і адзначэны яго гэрбам. Гэрб Скарыны: сонцэ ды поўмаладзік разам злучэныя. Які кароль, калі і дзеля якой заслугі даў Скарыні гэты гэрб—-вестак ні маем.

Дарэмна мы шукалі гэтага гэрбу у гэрбоўных польскіх кніжках: яго там німа. Растлумачыць гэта лёгка: польскіе гэрбоўнікі ні маюць ані сотай часткі гэрбаў беларуска-літоўскіх. Палякі чужымі гэрбамі і не цікавіліся, свае заўсёды ставілі высока, а на беларускіе і літоўскіе гэрбы глядзелі, як на гэрбы дзікіе. У нас пашырэны пагляд, што калі Уладыслаў Ягелла злучыў Літву-Беларусь з Польшай, дык нашые паны-магнаты ды баяры дасталі польскіе гэрбы, усе прывілеі ды і простых людзей у падданства. Што датычэ гэрбаў—гэта ні зусім праўда, дзеля таго, што і у беларусаў і у літвіноў былі свае радавыя знакі, ужываные на ваенных штандарах [сьцяг] хаця, разумеецца, ні усе іх мелі дый ужывалі. Вось гэтыя радавыя знакі і ужывалі даўней, як гэрбы.

Калі параўнаць польскія гэрбы з беларускімі ці літоўскімі, ясна відаць, што мы атрымалі ад братоў палякоў, а што маем свайго. Німа чаго і казаць, што нашых гэрбаў шмат.

Праўда, навука мала зусім таркалася гэрбоў, гісторыя, як цэлага нашага краю дык і аддзельных беларускіх родаў, знаходзіцца яшчэ у пялёнках, але усёткі кожны хто цікавіцца мінулым Беларусі, шмат цікавага знаходзе.

Пры Біблії Скарыны ёсьць і яго партрэт. На партрэці Скарына сядзіць перад столікам і пішэ. З левага боку пры ім цэлые фоліанты кніг, з бакоў, каля галавы, зьмешчаны гэрбы пратэктароў мэцэнатоў Скарыны. На зямлі, с правага боку Скарыны, стаіць пляцёны кошык. Гэткія кошыкі і дагэтуль спатыкаем у селян-беларусаў у ваколіцах Полацку.

Калі параўнаць друк Скарыны з друкам сучасным беларускім, дык сумна робіцца на сэрцы. Кніжкі Скарыны так прыгожа выданы, что нашых ані параўнаць з імі. Але ня ў тым справа. Кніжкі Скарыны да нас дайшлі, а ці дой-

дуць нашыя цяперашнія, беларускія друкі да нашых праўнукаў праз 100 гадоў? Напэўна не! Папера Скарынінскіх кніжак, як мы ужо казалі, моцная, трывалая; нашая ж папера фабрыкаваная кепска, с саломы, з дзерава, яна ужо праз нейкіх 100 гадоў разсыпецца. як пясок, і сьледу нашае працы для нашых патомкаў ні астанецца!

Якая на гэта рада?

А вось якая. Трэба старацца, каб кожны друк, кожная кніжка была адбіта на лепшай, моцнай ды трывалай паперы хоць у 25 экзэмплярах. Такіе кніжкі павінны быць разасланы па сьвеці у вялікіе бібліотэкі, дзе яны будуць старанна захаваны і для патомкаў астануцца.

Апроч гэтага, мы мусім стварыць і сваю нацыянальную беларускую бібліотэку, дзе павінны быць сабраны усе беларускіе кніжкі. Залажэньнем гэтага нацыанальнага фундаменту павінна заняцца Беларускае Навуковае Таварыства імяні Ф. Скарыны.

Калі мы маем быць праўдзівым народам ды ісьці уперад с культурай і цывілізацыей, мы мусім залажыць навуковае таварыства, а пры ім нацыянальную бібліотэку і музэй.

Да гэтай працы і клічэм мы усіх сьвядомых лепшых сыноў Беларусі.

Р. Земкевіч.



Маленькі фэльетон.

Сон рэдактара.

Жыў на сьвеці рэдактар аднае дэмакратычнай газэты. Як і ўсе людзі яго пакаданьня, ён натта пакутаваў ад пэнкнуўшай жоўці і дакораў нічыстага сумленія. Засьне ён, нябога, ці што небудзь робіць; пойдзе да знаёмых ці сядзе да столу, каб выпіць шклянку гарбаты (рэдка, але ужываў ён гэты панскі трунак), —а у ваччу ўсё міхцяцца зарэзаныя літэратурныя дзеткі, ніздаволяныя падпішчыкі, абражаныя палітыкі, абсьмеяныя паэты, ніпрыласканыя таланты. Апарт гэных людзей, складаўшых звычайны крыж яго жыцьця, аднекуль вылазілі і с кожным днём пладзіліся яшчэ іншыя стварэньня,—ні то людзі, ні то аргусы, ні то хрэн яго знае што. Яны усё бачылі, усё чыста ведалі і ад іх прагавітага вока ня было гдзе захавацца. Заманецца рэдактару пасьнедаць ці што, а аргус ужо сьцігае пад вокнамі і трагічна шапоча: «Вярашчаку есьць! А за чые грошы ён не есьць, каб хто спытаўся?!» Стане цяжка на сэрцы, замысьліцца рэдактар, аблёгшыся на стол, а аргус ужо цікуе: «Злоумышляе штось, Каін! У-у, гад, каб яму выхварэць!» Засьмяецца рэдактар,—а ўжо аргус камусь міргае: «Гляньця—Расія гіне, а ён радуецца!» Пойдзе ён з гора на спацыр, а кругом ужо шэпчуць: «Пацыбаў! Ідзі, ідзі Юдаш,—там Скірмунт з Радзівіллам чакаюць». Заплача рэдактар, прышоўшы да хаты, а аргус лямантуе: «Ось табе маеш! Панэ грошай ні далі,—бач, як разрюўся!» А калі часам натраніць рэдактару заснуць, дык ляманту й дакорам аргусаў няма канца. Яны выходзяцца каля рэдактарскай кватэры, тыцкаюць пальцамі у зачыненыя вокны і шыпяць, як вужакі: «Спіць нядаврак! Беженцы мруць, як мухі у восень, а ён сабе сьпіць,— і ні бырае».

Разумеецца, пры гэткіх варунках жыцьцё рэдактара паходзіла на якуюсь фантасмагорыю, а сапачынак і сон—на хваробліву пакуту. Дарэмна ён у паўночную гадзіну, перакідаючыся з боку на бок на пасьцелі, ужываў усё, вядомых самому і нараяных суседзямі, заходаў, каб як змарыць сон. Ні «Новая Заря», ні «Минскій Голос», ні артыкулы Крыжаноўскага і процьмы іншых «бѣлоруссовъ»,—нічога ні памагала і ні давала жаднае палёгкі. Рэдактар варочаўся, стагнаў і вёў начноную скаргу на Бога.

—«Мой моцны Божа! І па што Ты пусьціў мяне на сьвет, гэтакага адзінока, бяздольнага, нялюбага?»—скардзіўся ён. «Ні украў я нічога, ні забіў нікога, нават стары, як сабака, досі й ні жаніўся,—дык за вошта ж Ты мане караеш, чым угнявіў я ласку Тваю?! Раней, калі дэмакратызм у Расіі караўся законам, у мяне былі пэўныя прыхільнікі, верныя дружкі і шчырыя спагадачы. Кожны вечар, бывала, хадзіў я да пана цэнзара і аддаваў яму на перагляд свае рукапісы, напісаныя «кроў'ю сэрца майго і сокам нэрваў маіх». Стары дзядок [усе цэнзары былі тагды старыя дзядкі] чытаў, цёршыўся, потым браў асьцярожнаю дрыжачаю рукою чырвоны аловак ды, плачучы, выпэцкваў усё, с пачатку да канца. Ен разумеў мяне, а я разумеў яго; ён спачуваў мне, а я спачуваў яму, і абудва мы доўга, бывала, плакалі і тужылі над цяжкім становішчам беларускае літэратуры. І я ведаў, што кінуць мяне супрацоўнікі, пакінуць чытачы, паразбегаюцца у «сѣнь струй» паэты, а гэты старэнькі дзядок застанецца пры мне да апошніх дзён майго жыцьця, як пэўны сябар мае тугі, як пільная нянька мае пісаніны. Але вось прышла дэмакратыя, захварэў на перэпалахі і раптоўна памёр с пераляку мой ядыны дружак, і німа каля мяне нікога, апрач аргусаў». Гэтак скардзіўся рэдактар, і з воч яго бобам каціліся чарнільныя слёзы на скамечаную падушку.

Аднакрэць, стаў рэдактар чытаць артыкул па нацыянальнаму пытаньню вялікага знаўцы і спагадача,—ні то с польскага, ні то з маскоўскага боку. І сталася ніспадзяванае цуда: яго раптам змарыў сон. І сьніў вось што.

Ідзе ён па доўгай, гарбатай вуліцы у Мінску. Дзе-ні-дзе над казённым будынкам брындаюцца ў паветры парудзеўшыя чырвоныя штандары. Відны напісы па-польску і па-маскоўску: «рада салдацкая», «польская ядлодайня», «рада селянская», «польская кавярня», «камітэт георгіевскіх кавалераў». Каля камітэту—вялізная. як прасьцірадла, сіняя афіша:«Трэба ваяваць? Трэба! А хто ні хоча—па карку». І на усёй вуліцы—нікагутка. Нават аргусы кудысь пахаваліся. Толькі на коміні у Гарадзкой Думі стаяў «избранникъ минскій», галава Кашчанка, уціраў твар хустачкай і азіраў сваю маёнтнасьць. Потым распасьцёр рукі, як дэман крыльля, і засьпеваў на матыў «праклятый мір»: «Земля их велика и обильна,—а порядка нѣтъ и я пришел княжить и володѣть ими». Прасьпеваўшы гэта, ён праваліўся у коміну, як кампора. «Госпадзі! уздыхнуў рэдактар: «як слаўна жыць на сьвеці ось тут, на Беларусі. Палякі кормяць, каваю пояць, маскоўцы параду, уцеху,—духоўную страву, даюць, а «земгусар» наводны у гаспадзі рэй вядзе. І чаго вярадуюць гэтыя прагавітыя беларусы,—якога ім ражна трэба?! Дапраўды, церазь хлеб хлеба шукаюць»... У гэты мамэнт паказаўся панок. Ен спыніўся каля беларускае кнігарні ды стаў пільна углядацца праз шыбы. Раптам ён скалануўся, пераступіў с аднае нагі на другую і сказаў: «гм!» Падышоў другі, спыніўся каля яго і сказаў: «гм!» Падышоў трэці і гэтак сама сказаў: «гм!» Падышоў рэдактар і, ні спыняючыся, сказаў: «гм!»

Хадзіў рэдактар па пустым вуліцам у Мінску роўна тры гады і тры месяцы. За гэты час ён так агоўтаўся с тым, што колісь было пры нябошчыку цэнзару, што пачало здавацца яму, нібы старэнькі дзядок заварушыўся ў труне і заківаў да сябе чырвоным алоўкам. І напоўз страх па-за шкур'ю ў рэдактара і стаў азіраць ён у думках сваіх спіс сьмяртэльных грахоў сваіх і пытаць сябе: «Чым-жа я правінаваціўся? Ні спаў я, ні еў, ні сьмеяўся і ні плакаў, а тым часам—чаго-ж мяне жах прабірае?!» Тут споведзь яго абарваў зычны голас таго панка, што стаяў ля кнігарні і тыкаў посам у шыбы. «Дзяржы, мы ні папусьцімся, каб расхваталі Расію па часткам! Годзі,—лаві гэтага украінскага сэпарατыста!» Паназьбегаліся людзі с палкамі, с аскабалкамі, с навыскалянымі зубамі і —раптам скеміў рэдактар, уразумеў усёй сваёй істотаю, што вярнулася прамінулае, што ён зноў меціме пэўных дружакоў і ніразлучных падарожнікаў і крыкнуў на ўсе грудзі:

— Ура!

Ен прачнуўся. А аргусы стаялі каля вакна і гулі: «Крычыць, халера! Немцу сыгнал падае»... Але рэдактару было лягчэй на душы. Уставалі малюнкі мінулых дзён, а надзея расла і мацнела. Ці збудзяцца гэта, чытачу? Ты кажаш—не, і я кажу—не. Ішоў чынорык цераз пан-

У час вайны.

Як добра і шчасна увокал, як глянеш:
Тут рэчка плюскочэ, там гай,
Вун поле зялёнае, сьцежка зьмяіцца,—
Прышоў да нас зноў сьветлы май.
І радасна ў сэрцы, і хочэцца думаць
Аб шчасьці, аб сьветлым краю...
І вольные думы і сьветлые мары
Душу узьнімаюць маю.
Не!.. кіну на час нейкі шчасные думкі
У дні цяжкай і горкай жуды,
Лепш гляну, як родная вёска марнее—
Сумуе там люд ад бяды.
У час бітвы, як жэдная смерць жыцьцё косіць,
Ліецца скрозь братняя кроў,—
К табе душа рвецца, гаротнік—ваяка,
Табе аддаю ўсю любоў...
Надыдзе збавеньня, замоўкнуць гарматы;
Ізноў адпачынем душой.
І сонцэ прагляне сьвятлістым праменьнем
Над змучэнай нашай зямлёй.
Уцішым боль сэрца, загоім мы раны,
І сьмела зірнём на прастор;
К жыцьцю тады новаму мы уваскрэснем,
Душой узнясомся да зор!

Я. Журба.



Казкі жыцьця.

Процiў вады.

Ніхто не запамятае, калі асталеваўся тут стары Дзед. Дзед назіраў за парадкамі ў лесі, вартаваў луг і поле, быў поўным гаспадаром над усім, што было тут і без яго ведама не адбывалася жадная справа. Лес рос толькі там, гдзе паказываў Дзед, а калі якое дрэва і кідала сваё насеньне, ў аблюбованы грунт,—стары Дзед гневаўся і не даваў яму ходу... Можа, тое, што рабіў дзед, было найлепшым—спрэчацца не буду, тым боляй, што парадак у Дзеда быў нярвейшы. Кожнае стварэньне, кожная рэч, ведалі, дзеля чаго яны тут жывуць, якое іх мейсцэ на сьвеці і што павінны яны рабіць. Зірнуць на гэты парадак,—і то было прыемна.

Другое пытаньне, ці рады і давольны былі тыя, каго апякаў і над кім панаваў Дзед. Ды пра тое мо' й гаварыць лішня,—ці ёсьць на сьвеці такі, хто-б сказаў: «Я жыву так, што лепшага жыцьця і не хачу.»

Было тут Возярко,—чым яму кепска? Сама ўжо ўрода абдарыла яго хараством і ў сьветлыя яго воды любіло зазіраць сонцэ, прыгожыя, белыя хмаркі адбіваліся ў ім, як у люстэрку; ў ім купаў свае праменьня задуменны месяц і ціхія зоркі пераліваліся тут дзіўнымі агнямі розных колераў. Увакруг Возярка красаваліся пышныя кусты лозаў і ракіты, зялёным валам цягнуліся па беразі стройныя алешыны. А самае Возярко Дзед убіраў прыгожай вадзяной латоцьцю, засеяў пахучым аерам і разьвёў цэлыя нівы чаротаў. Дык ня дзіва, што Дзеду было крыўдна слухаць нараканьне гэтага Возярка. Але гэтага яшчэ мала: дачуўся стары, як тлумачыло Возярко дзедаў клопат па часьці убраньня яго, Возярка. Вот і чакай ты падзякі: Возярко казало, што лозы і алешнік пасеяны Дзедам дзеля таго, каб не даць жаднай волі вадзе, каб умацаваць бераг і гэтым самым трымаць на прывязі воду. Лозы й алешыны—гэта дзедавы служкі.

А вадзяная лотаць? а чароты, аеры?

—Лепяй зусім бы іх ня было, казала Возярко: гэтыя расьліны і краскі—магільныя крыжы для вады.

А як Дзед быў тутэйшы гаспадар, дык ён адзін нёс адказ за парадак цэлага маёнтку. І цьвёрда ведаў Дзед сваю справу!.. Каб больш затрымаць тут вільгаці, што так патрэбна для ўзросту лесу, траваў і краскаў, Дзед мусіў моцна трымаць у сваіх руках Возярко. А Возярку хацелося выліцца з прагніўшага лога, пайсьці другім мейсцам і крыху асьвяжыцца. Гэтае жаданьне і прагненьне волі павялічылося ў ім у значнай меры посьля таго, як сюды пачалі прабівацца крынічкі жывой вады. Яны разказывалі, гдзе ім прыйшлося пабыць і якую карысную зрабіць па сьвеці работу. Возярко чуло тут сьвятую праўду, і яшчэ большае нездаваленьне падыймалося ў ім проціў Дзеда.

—Пане гаспадару! —казало раз Возярко Дзеду —даволі я пабыло тут. Вада —такая рэч, што ня можа доўга стаяць на адным мейсцы: спакой вадзе гібель. Сам ты бачыш што на дно маё падае бруд, а ў гэтым брудзі завялося балотнае зельле...

—Мілае маё!— сказаў Дзед —ты ж тут не адно, а я павінен падумаць аб кожным з вас, і я ведаю, што дзеля поўнага парадку павінна быць чыя-небудзь адна воля; а калі кожны тут пачне жыць сваёю галавою, дык што тут будзе?

—Твая праўда, гаспадару, павінна быць адна чыя-небудзь воля,— дык нехай гэта будзе адна супольная воля - -воля жыць.

—Так, так! —падхапіў лес, луг і поле.

З гэтага часу і пайшла спорка—усе проціў Дзеда.

—Ах, вы свавольнікі, свавольнікі!—ўзлаваўся Дзед: я ваш гаспадар, і будзе так, як хачу я.

Прайшло яшчэ колькі часу.

Дзед рабіў таймаваньне, узмацняў берагі Возярка. Але надыйшла навальніца і паддала Возярку сілы. І ўсе дзедавы скрэпы былі знесены і яго самога зваліла вада.

Зьбеглі з неба хмары са сваімі пярунамі, ізноў глядзело сонцэ на зямлю, ласкало пакрыўджаных навальніцаю. Пазіраючы, як куляўся стары Дзед у грозных пeравалах Возярка, яно сказала:

—Умець жыць— умець у свой час саступіць. А проці вады ня доўга праплывеш.

Тарас Гушча.



Новасадзкае замчышча.

Над рэчкаю, над Слаўкаю, нідалёчка ад сьвятога месца Студзеньца, дзе спад дарогі на гары вада цудоўна выліваецца і спадае у яр глыбокі, а ярам у Слаўку цячэ, а Слаўка па каменях шапоча,—стаіць княжжа гарадзішча.

Высокія берагі Слаўкі парасталі усялякімі дрэвамі. Раслі там дубэ магутныя і сьветлыя ясені, ільміны, клянэ і алешыны, асіны трускія і бярэзіны касатыя, жэсцярыны шурпатыя і бружліны (брызгеліны) касьцяныя, чаромхі пахучыя,—ды ці мала усякага было! Над усім гэтым залегла ночка цёмная. Неба было засупляна чорнымі хмарамі, а вецяр сярдзіты раз ад разу зрываўся ды с шумам і сьвістам пралятаў над гарамі, над лесамі і над тым гарадзішчам, якбы штось нідобрае павяшчаючы.

Усе у гарадзішчы тым спалі, спалі і у месьці, што лежала у вілах гаміж Слаўкі і Вусы рэкі.

скі дворык, згубіў сякерку і тапорык. Ці рог, ці качан?

Па В. Сімпльтону перарабіў Я. Л.



Работнікі-беларусы у Петраградзі.

(Карэспандэнцыя).

Іх шмат тут, сыноў Беларусі. Горкі лёс адарваў іх ад родных ніў, цяжкая доля выгнала з бедных хатаў, і павандравалі яны у чужы вялізарны горад шукаць сабе хлеба. Вялікія і страшныя заводы і фабрыкі, хоць туга, але адчыняюць сваё цяжкія вароты і забіраюць па адном, па два, па дзесятку чалавек, аглушаюць іх стукам і бразгам молатаў, сьвістам гудкоў, замяняючы гэтым песьні птушак на родных нівах і шэпты вётру у зялёным гаю...

Іх многа тут, сыноў Беларусі. Ля варстакоў, ля домнаў, пры тачках,—усюды вы можаце напаткаць іх, адчуваючы мяккі гоман перакручанай роднай мовы. На ваша запытаньне: «ці ні беларусы адно вы?»—вам згодна адкажуць: «так, беларусы!» А так, самі ад сябе, яны ніколі ня ўспамінаюць свайго краю, цураюцца роднай мовы, прыладжваючыся да тэй, якая чуецца навокала. Хоць,—ведаю я, гарыць іх душа гарачым каханьнем да тых бедных вёсак, дзе жывуць іх бацькі, дзе гавораць так пекна, пявуча і гучна...

Мне шкода іх... Я ня злую ані званіна іх, не сярдую ні каліва, бо гэта цёмныя, закінутыя на далёкую чужыну людзі і горкай доляй, прымушаны ня толькі ня бачыць таго, што робіцца дома, у родным краю...

Але я мушу зласьвіць на другіх. Тут у вялізарным Петраградзі, шмат ёсьць такіх, што навучыліся і умеюць разбірацца у варунках жыцьця, каму ня хіба сьвядомасьці, хто ўмеў змагацца за увесь спаняверааны люд. О, яны ведаюць, як салодка жыцьцё уцісьнутых, не дзяржаўных нацый. Ведаюць яны, што і родная краіна іх, Беларусь, стогне ад зьдзеку і зьняваги, але на гэта не зьвяртаецца іх думка, сьвядома й наўмысьля прыдушана пачуцьцё да роднай старонкі. Ім убіта у голу сухая, аднабокая думка аб агульна-работніцкім інтэрэсі і убіта тымі, каго не абходзіць справа уціску нацый, каму нізнаёма тая падвойная сіла прыгнечаньня, якая цісьне беларуса, як работніка наагул і беларуса ў асобку.

Мне даводзіцца быць у гуртках працоўнікаў, у розных суполках, хаўрусах,—і усюды я спатыкаю шмат рабочых-беларусаў то з Віленшчыны, то з Міншчыны, то Вітэбшчыны і Магілёўшчыны. Я пазнаю іх на першаму слову і пытаю: беларус?—і адтрымліваю адказ: «так, беларус». Я пачынаю гаварыць роднаю мовай і бачу, як добра яны разумеюць яе і з дзівованым цікам слухаюць даўно ня чутую гутарку. Я размаўляю далей і пытаю: ці ведама ім, што робіцца у родным краю; ці спагадаюць яны адраджэньню свайго народу, а калі спагадаюць, дык ці гатовы прычыніцца да вялікай справы вызваленьня пакрыўджанай сваё Мацяры-Беларусі? Але махаюць рукамі, адварочваюць галовы, дадаючы пра марнасьць і нітрэбу роднае справы. Чаму?

О, пакрыўляныя, пакручаныя душы! І сярдую я на вас і шкадую вас: ня ведаеце, што робіце! Таварышы мае, сыны краю роднага! Брыдка вам, пазнаўшы праўду людскога самаўсьведамленьня, чурацца таго, што ёсьць гістарычнай патрэбай, паступовай шпыхільнасьцю у ланцугу вялікіх змаганьняў. Памысьліце...

Петраград. Ц. Гартны.



ПА БЕЛАРУСІ.

Новы Пагост, Віленскай губ.

У гэтай частцы Віленскай губ., што яшчэ ні забрана немцамі, шмат цяпер робіцца дзеля беларускай справы. Ад 20 ліпня г. г. Віленскі біскуп Э. Роопп адведывае каталіцкія парахвіі. Гэты пастыр—вядомы прыяцель Беларусі, шмат памагае цяпер нашай справі.

Першы куток Беларусі, куды найперш заглянуў пастыр,—Дзісна, гдзе мне і давялося быць у гэтыя часы.

Яшчэ чакаючы біскупа, ксяндзы беларускія радзіліся, як тут зрабіць, каб да беларусаў казання гаварыць па беларуску. Урэшці, дачакалі свайго правадыра. Назаўтра пасылаюць да яго дэлегата запытаць, ці ня можна гаварыць навуку па беларуску, а ён на гэта: «ня толькі можна, але і трэба».

А пачакаўшы некольні гадзін, бачу—зьбліжаецца да пастыра ксёндз і просіць яго благаславенства на беларускае казаньне. Яшчэ мінута і вось, як пацяркі, сыплюцца з амбоны беларускія словы. Людзі ня ведаюць, што рабіць; яны глядзяць то адзін на другога, то на прапаведніка, ўсё бліжэй да яго цісьнуцца і... як акамянелыя, слухаюць роднае слова. Слухаюць так, як польскіх навукаў, здаецца, ніколі не слухалі.

Пад вечар даведываюся, што мае быць сход дэлегатаў ад «Каталіцкай дэмакрацыі», што арганізуецца цяпер па ўсіх парахвіях. На гэтым сходзі мае быць пастыр. Іду і я туды. Аж і тут зазначаецца беларушчына. Адзін з дэлегатаў вітае па беларуску свайго пастыра, а той яму на гэта: «Трэба старацца, каб хоць раз гэты нешчасны народ прасьвятлеў... нацыянальнае адраджэньне яго выбавіць... шкода мне беларускага народу, бо яго гэтак крыўдзілі!»

А вось ужо завязалася спрэчка аб тым, чаму так цяжка арганізовываць беларусаў і як да гэтага найлепш падыйсьці. Тлумачаць усёляк. Адзін ксёндз даводзіць, што калі толькі праца над народам вядзецца не на народным грунці, дык ня будзе з яе жаднае карысьці. Пастыр згаджаецца з ім і яшчэ раз заахвочывае да працы над адраджэньнем беларускаго народу.

Я слухаю і вушам сваім ня веру.

І гэтая сьвятая праца вядзецца па ўсіх тых парахвіях, каторыя адведывае каталіцкі пастыр. Праца гэта надта шмат памагае справі беларускага адражэньня.

Колькі ужо гаварылася цёмным беларусам, што мова беларуская зусім ні брыдкая, што яна наша родная, што толькі яна нас прасьвеціць і зробіць людзьмі, а яны на гэта заўсёды адказывалі: «А ўсёж т'кі харашэй па польску ці па расійску і мы ня хочым, каб нас вучылі, ці да нас гаварылі па беларуску».

Цяпер нашы цёмныя браты, бачучы, як ксяндзы гаворуць навукі па-беларуску, як іх біскуп на гэта благаслаўляе, яны пачынаюць разумець, што так і быць павіннэ. Яны ўжо і цяпер кажуць: «Праўда, мы лепяй разумеям па свойму, бо гэта наша мова».

Словам, у тых парахвіях, гдзе праехаў пастыр, сьведамасьць цёмных беларусаў вельмі паднялася. Там ужо можна ўводзіць прасьвету па-беларуску. Нехай толькі хутчэй пішуцца кніжкі-падручнікі!

Значыць, шмат робіцца дзеля справы беларускай паміж беларусамі-каталікамі.

Пара ўжо і праваслаўным пастырам апамятавацца, кінуць нягодную чорнасоцянную працу... Пара пайсьці на спатканьне гаротнаму народу!

А с т.

с. Старыца, Слуцкага пав. Мінскай губ.

Туман, што панаваў тут уперад, зьнік. Селяне прыслухаліся, абгледзіліся. Ніштo сабе працуе мяйсцовы селянскі камітэт. Найбольш за ўсё прыходзіцца ваяваць яму з тутэйшай паняй Красіцкай і яе упраўляючым. Ім неяк прыкра, што камітэт пільна прыглядаецца, каб ніводзін кавалачак зямелькі ня пуставаў, каб ня гібла дарэмна сенажаць. На гэтым грунці і вынікаюць спрэчкі паміж камітэтам і паняй. Камітэт пастанавіў сваю плату кавалю, а то той драў сем шкураў.

Закладаецца хаўрусная крама. Селяне ужо злажылі на гэта 1900 руб.

Маецца значная цяга да прасьветы. З жыхароў сяла 16 чалавек акончылі вучыцяльскую сэмінарыю, 3—вучыцяльскую царкоўную школку, а 8 дзяўчатак вучацца ў гімназіі і вышэйшай пачатковай школцы.

З р э б и ы.

Адна толькі у гарадзішчы душа ня сьпіць, ўсё па валу ходзіць і знаць думу цяжкую думае, бо аж пот на белум лбе выступае пэрлістымі кроплямі.

А хто гэта ходзіць, як ні княжна слаўная красою і багацтвамі сваімі? Яна і ростам высока, і с твару красна, хоць ні так-то ўжо малада,—і поўныя грудзі яе вісока падымаюцца, і вочы яе карыя аж у цямнаце сьвецяцца, а буйныя косы яе вецяр па воздусі трэпле.

Ходзіць княжна гордаю ступою, ды на сэрцы у яе, знаць, дужа ні весяла, бо усё: то рукі заломіць, то млосна іх апусьціць, то ўздыхне цяжка, як канаючы, то аберуч галаву сьцісьне, вачыма сьмялей у даль гляне і заходзіць байчэйшаю ступою: то ізноў яе сэрца зойдзецца, рукі павіснуць і вочы затуманяцца, і ногі як-бы падкашывацца стануць. Але вот на штосьь яна канцом адважылася, Пашла хуткаю ступою у гарадзішча, чэлядзь сваю будзіць, прыказывае усё багацтва зьбіраць, і што дарожшае, тое у скрыню ковану кладзе, а што меней варта, тое чэлядзі раздае. Сабраўшы усё і спакаваўшы, скрыню зачыніла, на тры замкі замкнула, а ключэ на залаты паясок нанізала і сама ім апіразалася. Тады, сеўшы на скрыню, горка заплакала і кажа:

— Німа у мяне ні шчасьця, ні долі, ні вернага друга... Німа с кім дзяліцца ні сваёю красою, ні каханнем, ні багацтвам вялікім: а маладасьць мая уцякае. Твар мой белы пажоўцеў, грудкі мае поўныя сталі павядаці, вочкі мае карыя—ліняці; буйныя косы сталі выпоўзаці, сэрца-ж маё стала заміраці. Ніхай-жа, калі так, я згіну і ўсё са мною: і думкі мае, і каханьне маё, і краса мая, і багацтва маё, бо так сіратліва жыці ні магчыма мне!..

І прыказала свім служкам прывязаці сябе да скрыні і кінуць у калодзіш вельмі глыбокі і поўны вады, што у тым гарадзішчы на дварэ быў.

Загула-зараўла навальніца з неба,—з громам, з градам, с пярунамі ды бліскавіцамі. А прайшла навальніца і—краснай княжны ні стала: кінулі яе верныя служкі у студню глыбокую.

І апусьцела зараз тое гарадзішча, а потым і зусім яго ні стала, адно гара з валам ды с калодзіжам, поўным камепьняў, тое мейсца значаць. На мейсца тое скора вораг люты напаў: людзей павырэзаў, дамэ з зямлёю зраўнаваў, а тое мейсца людзі «Рэзанамі» празвалі. Каму-ж Бог судзіў жывым застацца, тыя трохі воддаль, на гары пад крыніцамі пабудаваліся, насупраціў таго гарадзішча і Студзіньца і празвалі сваё новае сялішча Новасадамі.

[Пісана у 1898 г. друкована у «С.-З. К.» 1902 г.]

К. Каганец.



Халера 40-га року.

Настала лета саракавога року, і страх вялікі агарнуў людзей, бо як спад Менску, так спад Койданава і спад Радашкавіч і ад усюль наўкруг чутно было, што халера людзей коціць. Людзі нідзе ня выезджалі, ніхто і ў нашу старану ні заглядаў. Усе сталі неяк нівесялы, але пакуль што у нас, каля Волмы, ніхто ні захварэў.

У адну так нядзельлу сьвятую Бог даў раніцу вельмі красную. Як раз зачалася касьба і мейсцамі свежынькае сена стаяла ўжо у копах. Ранні сьвежы воздух быў насякшы пахамі новага сена і красак яшчэ нікошанай сенажаці. Сонца паволі вылынала з-за далёкага лесу і адбівалася у расінках, на ўсялякіх кветках, аганькамі. Пакоша выглядала, як усыпаная дарагімі каменнямі. Пастушке выгналі сваю гавядку, каторая са смакам скубла чуць паадскакваўшую сочную травіцу. Так усё было хараша, весяла,—здаецца і ні падумаў-бы аб яком нішчасьці. Тым часам старэйшыя штось як-бы чулі. Усякі, каго ні сустрэняш, ідзе нейкі насупляны і слова ні пракажа. А калі запытаеш ці завядзеш гутарку, дык адказваюць нехаця, як-бы баючыся большай размовы, ды кожны ідзе па сваёй справі.

Пасуць пастушкі сваю скацінку на сьвежай пакошы,—аж бачаць, як з дарогі ідзе якаясь баба, уся мокрая да руба. Прышла яна да аднае капіцы і лягла пад сена. Пастушкі, вядома блазнота, падшывальцы,—абступілі яе здалёк, ніначай птушкі саву, або вараньнё арла, але блізка падыйсьці баяліся, хоць і дужа цікавасьць брала. Гэтак стоючы, давай яны шпурляць у яе чым папала: хто пакалком, хто грудкаю, хто каменьчыкам. І так ёй ні давалі супакою амаль ні да поўдня, хоць тая і прасілася і малілася, каб далі ёй сапачыць крыху. А даляй ня вытрывала ды й кажа:

— Чакайце, калі так. Папомніце вы мяне!

Ды зышла ім з вачэй. А з гэтага дня у нашым сяле стала халера людзей каціць с канца ў канец. Мала хто жыў застаўся.

* * *

Была ужо сярэдзіна лета. Пагода стаяла харошая. Буйнае жыцяйка высьпела як мае быць і хіліла свой поўны колас да зямлі, адно жаць яго неяк ні хапаліся. Усе хадзілі, як патручаныя, бо халера стала ужо і ў наша сяло заглядаць, а пра суседняе, то й казаць нечага,—там мала хто жыў застаўся. Толькі на адну ніўку над лесам вышла жонка і стала жаці.

Ні нажала яна яшчэ двух снапоў, як выйшз лесу нейкая дзяўчына уся ў белум і сама белая, як малако, ды пры тым такі дужа прыгожая. Тую жонку паняволі якісь ляк узяў.

Падышла белая даяўчына з сярпом і, заняўшы постаць пры той жанчыні, давай жаць і снапэ вязаць,—усё як мае быць. І гэта робіць яна усё моўчкі, а жонка гэтак сама баіцца да яе загаварыць, толькі дзівіцца на яе раз ад разу. Так жнуць, завіхаюцца, покі ня прышла пара палуднаваць. Жанчына адважылася ды кажа:

— Я схаджу дамоў папалудную,—можа табе чаго прынесьці?

— Шклянку малака, калі ласка,—больш нічога,—сказала тая і давай зноў завіхацца. Жанчына, папалуднаваўшы, прынесла той дзяўчыні шклянку малака, а тая выпіла, падзякавала,—ды сталі зноў жаць і маўчаць.

Жнуць так моўчкі, завіхаюцца,—і вечар ужо блізка. Тая дзяўчына паглядзела-пагдядзела у лес ды кажа:

— Зараз, зараз іду.

А сказаўшы, зноў пачала жаць. Жанчына вума ні дабярэ, што яно такое. Чуе—крача, глянула—крумкач ляціць з-за лесу. Дзяўчына абярнулася да яго і кажа:

— Зараз, зараз іду, адно сноп дажну.

— Гэта, кажа, мой брат мяне на вясельля кліча. Як дажала сноп, звязала яго як трэба ды пайшла сабе ізноў у лес, як прышла.

С таго часу халера стала сьціхаць, сьціхаць і заціхла.

1902 г. К. Каганец.

Зьезд настаўнікаў сярэдніх школаў Віленскай Вучэбнай Акругі.

23 жніўня ў Магілёві пачынаецца зьезд настаўнікаў сярэдніх школаў Віл. Вуч. Акр. Паміж іншым будзе разглядацца пытаньне аб выкладаньні ў школах Акругі гісторыі Беларусі, геаграфіі краю і інш. Зьезд працягнецца 6 дзён.

Мінск, 17-жніўня (П. Т. А.) Адбыўся арганізацыйны зьезд зямляўласьнікаў і селянскіх гаспадароў Магіл., Мінск. Вітэбск. і Віленскай губ., меўшы мэту утварэньне краёвага хаўрусу. На зьездзі пастанавілі утварыць краёвы орган хаўрусу зямляўласьнікаў. Ухвален статут хаўруса і апрацаваны план яго чыннасьці.

Апошнія навіны.

Агульныя весткі.

Дэлегаты ад Цэнтр. Рады белар. арганіз. на Маскоўскай Дзяржаўнай Парадзі.

Дэлегаты ад Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый на Дзяржаўнай Парадзі ў Маскве былі: Р. Астроўскі, Ф. Галавач [Мінск], Варонка, Багдановіч [Петраград], Краскоўскі [Кіеў] і Бурбіс (Масква).

Зьезд папячыцляў вучэбных акругаў.

ПЕТРАГРАД 17—VIII. Зачыніўся зьезд папячыцляў вучэбных акругаў. Зьезд пастанавіў, што ў мяйсцовасьцях з інародным насяленьнем навучаньне ў казённых пачатковых школах павінна весьціся ў мяйсцовых нацыянальных мовах.

Расійцы пра Маскоўскую параду.

У Маскве адбылася парада (12/VIII-16/VIII), скліканая Часовым Урадам. На гэтай парадзі, памім іншым сац. дэмакрат Цэрэтэлі павітаўся за руку з буржуазным прэдстаўнікам, к.-д. Бублікавым. У гэтым выпадку «Нов. Время» бачыць паразуменьне працы с капіталам. «День» піша, што парада зрабіла больш, як можна было спадзявацца. «Изв. С. и Р. Д» кажуць, што парада умацавала сілы дэмакратыі. Супраціўніка аслабіла моцная улада, патрэбная Расіі. «Рабоч. Газэта» падкрэслівае, што ні водная з уплывавых груп ня вымагала адстаўкі Ураду. «Русская Воля» кажа, што парада паказала, што прымірэньне паміж буржуазіей і працоўным народам магчыма, бо усе падцьвердзілі каоліцыйнае міністэрства.

Эвакуацыя Петраграду.

З Петраграду вывозяцца найвялікшыя заводы. Тлумачаць гэта тым, што Петраград стаіць далёка ад мейсц выплаўкі залеза, ад мейсц, гдзе капаюць вугаль. Не гледзючы на гэта, фабрык у Петраградзі шмат і за час вайны лік іх яшчэ павялічыўся. Як да вайны—дык да Петраграду прывозіўся па моры ангельскі вугаль, а цяпер усё прыходзіцца везьці з Паўднёвай Расіі. Як пасьведчыў таварыш міністра промыслаў і гандлю, трэцяя часьць усіх вагонаў занята падвозкай сырога матер'ялу і вугольля на Петраградзкія заводы. Заводы гэтыя цяпер пераводзяцца у такія мейсца, гдзе ім усё было-б пад рукою, каб не трэба было займаць вагонаў па падвозку да іх сырызны. Покі што, харчавая справа у Піцяры стаіць дрэнна. Забаранена цяпер прыежджаць да Петраграду без дазволу дзеля таго, каб не набіралось шмат лішніх людзей; пачатак вучэньня ў вышэйшых школках адкладзены гэтак сама да 1 кастрычніка (акцябра), а газэта «Русская Воля» паведамляе, што нават да 15-го кастрычніка.

Падвышэньне цаны на газэты.

Зважаючы на дарагоўлю паперы і усіх іншых выдаткаў па друкаванню, многа Петраградзкіх газэт («Рѣчь», «Бирж. Вѣдомости», «Воля Народа», «День», «Новая жизнь», «Дѣло Народа» і інш.) с 1-го сенцябра пабольшваюць часова плату да 20 кап. за асобны нумар. Разам с тым набольшана плата і на падпіску (4 рб. на месяц).

Аўтаномія Латвіі.

Рыга 29—VII. Рыжская Рада работніцкіх і салдацкіх дэпутатаў, абмяркаваўшы пытаньне аб аўтаноміі Латвіі прыняла рэзалюцыю, ў якой трэбуе:

1) Утварэньня едзінай недзялімай Латвіі, як палітычна аўтаномнай краіны, ў склад каторай павінны ўвайсьці латышская часьць Ліфляндзкай губ., Курляндзкая губ. і Летгалія,

2) Уся мяйсцовая гаспадарская, палітычная і адміністрацыйная ўласьць павінна належаць Сойму Латвіі, выбранпаму агульным, простым, роўным, патаемным і прапарцыанальным галасаваньнем кабет і мужчын.

3) Тэрыторыяльныя граніцы Латвіі с сумежнымі часьцямі Расіі устанаўляюцца самым насяленьнем.

З Украіны.

Адклад зьезду народаў-фэдэралістаў.

На сходзі Украінскай Цэнтральнай Рады 9 жніўня, пастаноўлено: зьезд народаў, якія дамагаюцца фэдэратыўнаго перабудаваньня Расіі, што быў назначаны на 15 жніўня, пераносіцца на 8 верасьня (сенцябра).

Украінскі Устаноўчы Сойм.

На сходзі Украінскай Цэнтральнай Рады 9 жніўня посьля дакладу Сябрукаў і невялікіх спрэчак, была ухвалена такая рэзалюцыя ў справі скліканьня Украінскаго Устаноўчаго Сойму, запрапанованная фракцыёй У. С.-Р.'аў:

«Стоючы на грунці нічым ня абмежованага прынцыпу самаадзначэньня народаў і ўважаючы, што толькі само насяленьне Украіны можа пастанаўляць аб палітычным ладзі Украіны і аб яе адносінах да Расіі,—Украінская Цэнтральная Рада уважае патрэбным як найхутчэй склікаць Устаноўчы Сойм этнаграфічнай Украіны.

Дзеля гэтага Цэнтральная Украінская Рада мусіць ніадкладаючы выбраць камісію, якая павінна вырабіць парадак скліканьнк Украінскаго Устаноўчаго Сойму і, парадзіўшыся і прышоўшы да згоды з гэнэральным сэкрэтарыятам унутраных спраў і органамі мяйсцовага самакіраваньня яго».

З Фінляндзіі.

Як мы пісалі ўжо ў № 10 «Вольнай Беларусі» Фінляндзкі Сойм выдаў закон аб «вярхоўнай дзяржаўнай ўласьці ў Фінляндзіі». Расійскі Урад пастанавіў зачыніць Сойм і назначыць новыя выбары. Фінляндзкі Сэнат большасьцю 7 галасоў проціў 6-сацыялістаў пастанавіў распублікаваць пастанову Расійскага Ураду. Зараз жэ посьля гэтага пачалася агульная забастоўка ў Гэльсінгфорсі, глаўным горадзі Фінляндзіі, у знак пратэсту проціў таго, што Часовы Урад мешаецца ў фінляндзкія справы. Сацыялісты, быўшыя ў Фінляндзкім Сэнаці, падаліся ў адстаўку і першай умовай аднаўленьня сваёй працы пастанавілі скасаваньне пастановы Расійскага Ураду аб зачыненьні Сойму і аднаўленьне працы цяперашняга Сойму. Расійскі Урад не згаджаецца з гэтым. Сацыялісты, якіх у Соймі большасьць, пастанавілі склікаць Сойм 29 жніўня. Абвестка аб гэтым афіцыяльна апублікавана Канцылярыяй Сойму. Расійскі урад даручыў Гэнэрал-Губэрнатару Фінляндзкаму сілаю не дапусьціць адчыненьня Сойму. На сходзі Краёвай Рады Работніцкіх і Салдацкіх дэпутатаў (расійскіх) у Гэльсінгфорсі пастаноўлена: падтрымаць Часовы Расійскі Урад.

Калі ў назначаны тэрмін дэпутаты сталі зыходзіцца у Сойм, дык расійскае бойска, стаяўшае дзеля гэтага на варці каля Сойму, ня пусьціла нікога у будынак. Тальман Сойму, Маннер, даведаўшыся генэрал-губэрнатора Стаховіча, выславіў яму пратэст з выпадку забароны сабрацца Сойму, рахуючы такія заходы нізаконнымі. Стаховіч абяцаў сказаць аб пратэсьці Часоваму Ураду.

Вайна.

За апошнія дні на Заходнім фронці трывала толькі перастрэлка, найболяй моцная на Віленскім кірунку.

На Рыжскім вучастку Паўночна—Заходняга фронту апошнімі днямі здарылось вялікае нешчасьце. 19 жніўня а 7 гадз. раніцы немцы пачалі артыльлярыйскі абстрэл нашых пазіцый у районі Іксюляна на паўдневы ўсход ад Рыгі. Нашэ войско, стаяўшае на правым берaзі, адыйшлося ад ракі. Немцы навялі два пантонныя масты. Наша артыльлерыя разбіла іх, але наша пяхота ўсё-ж такі не змагла ўстрымаць націску ўжо перайшоўшых гэрманцаў і адступіла ад ракі на 10 вёрст. 20 жніўня гэрманцы вялі бітву на паўночным берaзі Дзьвіны на фронці Шталь—Мэльмугэр—Сарыптэ—Лаўстын і усьцье ракі Огэр. Пад вечар 20 жніўня ім удалося прарваць нашы пазіцыі на рацэ Эгэль у районі Мэльмугэр—Скрыптэ. Некаторыя з нашых часьцей самавольна кідаюць пазіцыі і адходзяць на поўнач. Рыга пакінута нашымі вайскамі, бо, дзякуючы прарыву пад Іксюлям, яна была абойдзяна немцамі з паўдневага ўсходу.

Пераход немцаў на правы бераг Дзьвіны і забраньне імі Рыгі шмат азначае. Цяпер ім дарога на Петраград—вольная. Падаючысь на паўднёвы ўсход, яны могуць абыйсьці Дзьвінск і выйсьці ў тыл ўсяму Заходняму фронту. Гэта бы адзначало, што расійскай арміі на Заходнім фронці прыйшлося-б кінуць цяперашнія пазіцыі і адыйсьціся далёка за Мінск,—да Бярэзіны, або й да Дняпра. Як што будзе,—будзем бачыць.

На Румынскім фронці за апошнія дні Стаўкаю зазначаюцца выпадкі няпакорства, нявыпаўненьня баявых наказаў і т. д. Так, з раніцы 14 жніўня праціўнік пачаў наступаць ад Чарнавіц на Новаселіцу. Каля Баяну наша пехота, не чакаючы атакі праціўніка, пакінула свае акопы і пачала адступаць на ўсход. Часьці, быўшыя ў рэзэрві гэтага вучастку, разбегліся. Аўстрыйцы дайшлі да Лехучэні. Раніцай 15 жніўня праціўнік аднавіў сваё наступленьне на Факшанскім кірунку. У районі Мунчэлю адна з нашых дзівізіяў у безпарадку кінулася адступаць, ні сапраціўляючыся так як трэба было-б, націску ворага. Пад вечар праціўнік дайшоў да лініі Ірэшці—Дэ Сус—Ворніца—Фіціанэшці—Чыаляпэшчы. У ноч на 16 жніўня ён прарваў нашы пазіцыі ў районі Варніцы. 16 жніўня большая часьць двух нашых палкоў, займаўшых акопы каля Ірэшці, кінула іх і адышлася на поўнач. І толькі 18-19 жніўня удалася стрымаць немцаў.

На Французскім фронці ангельцы і французы, хоць і памалу, але пасуваюцца наперад і сваёй работай ні даюць немцам перавозіць войска на расійскі фронт. Поруч з французамі, ангельцамі, расійцамі і бельгійцамі на Французскім фронці бьецца ужо і партугальскае войска. Французы пачынаюць фармаваць польскую армію з дабравольцаў. Як спадзяюцца, лічба гэтай арміі дойдзе да 100,000 чалавек. Бачучы ніпарадкі ў расійскай арміі, сярод хаўрусьнікаў зьявілась думка перавезьці на расійскі фронт японскае войска.

На Італьянскім фронці італьянскае наступленьне ідзе даляй. У бітвах бяруць учасьць і аэрапляны.

На Балканскім фронці трэба зазначыць, што грэчэскае войска ужо начало разам з хаўрусьнікамі ваеваць проціў немцаў і баўгараў.



Пачтовая скрынка.

Салдату П. Дзі-вічу. Думка добрая, але слаба, пракламацыйна і ні па-беларуску напісана. С ціперашнімі вучыцялькамі беларускаму народу ні па дарозі. Увязаўшыся за імі, як раз можна трапіць назад і прыдыбаць к разбітаму карыту. Падавайце весткі.

Аршанскаму міліцыанэру. Ні цяміце, паночку, па-беларуску? Гэта нічога, загоіцца,—але ось напэўна, добра разумееце па маскоўску. Дык паслухайце, калі ласка: «Невѣжда судить точно такъ: въ чемъ толку не пойметъ, то все у него пустякъ».

І. Я. Чалееўскаму. Вы ні жартуючы сказалі, што «сяк так накрэмзалі». Раіць «абжыдаць» і за разам клікаць «рабіць новае жыцьцё»—гэта і называецца накрэмзаць. «Горка плача Беларусь» ні падойдзе. Аб гэтым пісана і перапісана, а пастаянна плакаць і брыдка і надаедна. Што датыча верша »Скора», дык мусім сказаць, што рыфмаваць «уваскрэсьне» с словам «трэсьне» занадта рызыкоўна.

Карсун. Я. Журбе. Дзе-што надрукуем. Прысылайце больш.

Сімфэропаль. Евг. Зан-чу. Гэта ваша асабістая справа і на людзі выносіць ні варта. Схавалі ў кошык...

Кіеў. А. Ф. і Г-чу. Вершы мала апрацованы. Надрукаваны ні будуць. Прысылайце, што маеце.

Мір. Сяўцу. Рэдзінька, як зацірка у бежанца. Над вершам працуюць уважней.

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ.

Шаноўны Пане Рэдактару!

Будзьце ласкавы даць мейсца у Вашай паважанай газэці нашай гэтай шчыра праўдзівай вестцы.

Мы, трое салдат с фронту, паехалі у вёску Гатово, Мінск. г. Мінск. пав. Самохвалавічск. вол., купіць бульбы. Сустрэўшы нейкую дзяўчыну, пытаем:—«Паненачка, дзе тут можна купіць бульбы?» У гэты ж мамэнт падыходзе да нас казак і пытае дзяўчыну, чаго яна стаіць з намі, а пасьля, больш нічога не кажучы, пачынае яе лупцаваць нагайкай. Падляцеў і другі казак дый кажа: «гэтага іщчэ мала», ды й пачаў біць дзяўчыну кулаком па твару.

Цяжка было глядзець нам на гэты зьдзек і слухаць, як дзяўчына стала прасіцца і маліцца. Дык вось як шануюць людзі волю!

Просімо усіх сяброў-салдатаў катэгарычна пратэставаць проціў усякіх такіх і падобных учынкаў, а зрабіўшым гэтакую брыду нехай будзе назаўсёды сорамна.

Просім другія газэты перадрукаваць.

Салдаты 51-га Артыл. асобнага дывізіону.

Ходорэв, Шышлов. Сасновіч.

Рэдактар Я. Лёсік.

Абвесткі.

ЗУБНЫ ДОКТАР
З. ФЕДАРОВІЧ.
Захараўскі завул. д. 9. кв. 3. Прыймае ад 9 да 2 і ад 4 да 7 гадз.



Выдавец «Т-ва Беларускай Культуры»

Друкарня Н. М. Нахумова. (старшага)